на матчи можно было и предложением бесплатных продуктов: сэндвичей со свининой, кока-колой, блинчиков с кленовым сиропом и т. п.). Она раскрывала вкусовые пристрастия среднего американца (индейка от Льёрки, куриный пирог, шпинат, гамбургеры и т. д.). Рекламодатель с помощью рекламных вставок в анимационные фильмы убеждал зрителя, то есть потребителя, что с каждой покупкой, сделанной под воздействием рекламы, он может приблизиться к образу «идеального американца», истинного патриота своей страны.

Таким образом, реклама в мультфильмах стала не только способом обогащения продюсеров и производителей товара, но и методом привлечения огромного числа покупателей со всего мира, желающих примерить на себя, что значит жить «по американскому образу». Кроме того, вставка рекламных роликов в анимационные ленты опосредовано воздействовала на взрослых потребителей через их детей, впитывающих информацию, как «губка», и зачастую не осознающих, откуда вдруг появилось желание приобрести ту или иную услугу/продукт определенного производителя, что, по сути, и являлось основным стимулом для того, чтобы крупные фирмы продолжали вкладывать немалые средства в производство кассовых мультфильмов и были готовы выступать спонсорами многочисленных анимационных проектов.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МЕНЕДЖМЕНТ У СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ: МАНІТОРЫНГ ЯК ЭФЕКТЫЎНЫ СПОСАБ КІРАВАННЯ ФАКТАРАМІ РЫЗЫК У АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ТВОРЧАЙ УВА

***Л. Ф. Голікава,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык аддзела менеджменту якасці адукацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Сучасная сістэма вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь знаходзіцца ў працэсе пераўтварэння, змены, гэта значыць, у працэсе мадэрнізацыі. Рашэнне такіх праблем, як ува-

ходжанне беларускіх устаноў вышэйшай адукацыі (УВА) у адзіную еўрапейскую культурна-адукацыйную прастору (у рамках Балонскай сістэмы), і ў той жа час імкненне захаваць іх нацыянальную ідэнтычнасць, застаецца па-ранейшаму актуальным.

Універсітэт культуры і мастацтваў як складаная па структуры ўстанова вышэйшай адукацыі звязаны з зацікаўленымі бакамі – з канкрэтнымі спажыўцамі адукацыйных паслуг: грамадствам, дзяржавай і асобнай асобай.

Сёння значна павысіліся патрабаванні да якасці адукацыі, кардынальна абнаўляюцца тэхналогіі навучання. З'яўленне на рынку адукацыйных паслуг розных катэгорый заказчыкаў, зацікаўленых у падрыхтаваных маладых спецыялістах, спрыяе ўзмацненню адказнасці УВА за якасць і эфектыўнасць адукацыйнай дзейнасці, якая залежыць:

– ад забеспячэння высокага ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, што асабліва актуальна ва ўмовах абвастрэння канкурэнцыі (узнікненне канкурэнтнага асяроддзя на рынку адукацыйных паслуг выяўляе праблемы якасці адукацыі);

– ад узмацнення, з аднаго боку, супярэчнасцей паміж патрабаваннямі грамадства і дзяржавы, якія ўзрастаюць, да прафесійных і інтэлектуальных кампетэнцый выпускніка і, з другога боку, ад рэальнай (фактычнай) ступені яго (выпускніка) адукаванасці, прафесіяналізму і развіцця;

– ад якасці зместу адукацыі і якасці адукацыйных тэхналогій, у тым ліку інавацыйных, накіраваных на развіццё новых методык і форм.

Для паспяховага функцыянавання ў новых умовах БДУКМ як творчай навучальнай установе неабходна пастаянна адсочваць стан рынку адукацыйных паслуг, ацэньваць уласнае становішча на ім, прымяняць метады прагназавання далейшага развіцця рынку. Менавіта ў падобных умовах узнікае магчымасць з'яўлення дадатковых рызык пры забеспячэнні адпаведнай якасці адукацыйных паслуг.

Як вядома, сфера вышэйшай адукацыі – досыць спецыфічная галіна, для якой характэрны асаблівыя фактары рызыкі. Так, з пункту гледжання наяўнасці рызык дзейнасць БДУКМ можна разглядаць у кантэксце якасці падрыхтоўкі спецыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лістаў. Апошняя, у сваю чаргу, павінна адпавядаць устаноўленым стандартам і нормам, павінна быць забяспечана рэсурсамі тэхналагічнымі (матэрыяльна-тэхнічнай базай, фінансамі, адукацыйнымі праграмамі, вучэбна-метадычнымі матэрыяламі і інш.) і рэсурсамі чалавечымі (кадравым патэнцыялам, які валодае прафесійнымі кампетэнцыямі, адпаведным кантынгентам абітурыентаў і да т. п.). Пры гэтым важная роля адводзіцца як якасці асноўных працэсаў дзейнасці ўніверсітэта з прыцягненнем найноўшых адукацыйных тэхналогій, што непасрэдна забяспечваюць падрыхтоўку спецыялістаў, так і якасці вынікаў гэтай дзейнасці па задавальненні запытаў рынку працы.

У працэсе ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці сустракаюцца розныя віды рызык. Вылучаюцца як знешнія, так і ўнутраныя рызыкі, якія ўзаемазвязаны паміж сабой. Напрыклад, памяншэнне бюджэтнай складальнай фінансавання (знешнія рызыкі) вядзе да недастатковага развіцця матэрыяльнай базы ўніверсітэта (унутраныя рызыкі); эканамічны крызіс (знешнія рызыкі) абумоўлівае высокую цану адукацыйных паслуг (унутраныя рызыкі); канкурэнцыя сярод УВА, прамая залежнасць ад сусветных тэндэнцый развіцця адукацыйнага працэсу ўплывае як на пагаршэнне (альбо паляпшэнне) яе іміджу на рынку адукацыйных паслуг, так і на забеспячэнне (альбо незабеспячэнне) належнага ўзроўню якасці гэтых паслуг; змяненне заканадаўства РБ у галіне адукацыі вядзе да неадпаведнасці прапанаванага набору адукацыйных паслуг патрабаванням рынку; змена кан'юнктуры рынку працы вызначае эфектыўную/неэфектыўную кадравую палітыку; скарачэнне колькасці абітурыентаў прыводзіць да з'яўлення недастаткова падрыхтаванага кантынгенту студэнтаў і інш.

Выяўленню ўнутраных і знешніх рызык і вызначэнню магчымасцей для павышэння задаволенасці спажыўцоў і зацікаўленых бакоў спрыяе сістэма менеджменту якасці БДУКМ як важнейшы механізм унутраных гарантый якасці адукацыі.

Разгледзім адзін з фактараў унутраных рызык, якія аказваюць уплыў на адпаведнасць паслуг, што прадастаўляе БДУКМ. Гэта – забеспячэнне належнага ўзроўню якасці адукацыйных паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Узровень прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў: пазіцыя работадаўцаў*

Аналіз ступені задаволенасці спажыўцоў (работадаўцаў) маладымі спецыялістамі БДУКМ дазваляе выявіць асноўныя патрабаванні да выпускнікоў. Гэта, па-першае, патрэба ў высокакваліфікаваных спецыялістах рознага профілю, па-другое, патрабаванні да ўзроўню іх прафесійнай падрыхтоўкі і, па-трэцяе, – да эфектыўнага практычнага навучання студэнтаў у працэсе атрымання імі адукацыі.

Работадаўцы адзначаюць ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі выпускнікоў універсітэта па спецыяльнасці, узровень іх практычных ведаў і ўменняў, агульную эрудыцыю, культуру, дасведчанасць у сумежных абласцях. Так, кантынгент выпускнікоў БДУКМ, якія працуюць у беларускіх музеях, у цэлым, на думку работадаўцаў, выдатна падрыхтаваны, высокапрафесіянальны як у тэорыі, так і на практыцы.

Па водгуках работадаўцаў, выпускнікоў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, якія атрымалі першае працоўнае месца ў буйных гарадскіх, абласных і рэгіянальных бібліятэках Беларусі, вылучае добры ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі і агульная эрудыцыя. Прафесійныя якасці выпускнікоў факультэта музычнага мастацтва работадаўцамі у цэлым ацэнены станоўча. Спецыялісты па сацыякультурнай дзейнасці, на думку кіраўнікоў установаў культуры, валодаюць добрымі прафесійнымі якасцямі, дастатковымі ведамі, эрудыцыяй і культурай.

Узаемадзеянне БДУКМ і работадаўцаў дазваляе не толькі забяспечваць высокакваліфікаванымі кадрамі маладых спецыялістаў першыя працоўныя месцы, але і садзейнічае выстройванню сістэмы арганізацыі вытворчай практыкі, здольнай сфарміраваць прафесійныя кампетэнцыі ў выпускнікоў БДУКМ яшчэ ў працэсе навучання. Менавіта таму найбольш аб'ектыўную ацэнку якасці адукацыі выпускнікоў універсітэта прадастаўляюць работадаўцы.

*Арганізацыя вытворчай практыкі ў БДУКМ: пазіцыя студэнтаў*

БДУКМ увесь час спрыяе ўсталяванню партнёрскіх адносін з установамі і арганізацыямі культуры і мастацтваў (месцам практыкі), улічвае іх патрабаванні. Студэнты ўніверсітэта ў працэсе праходжання вучэбнай і вытворчай практыкі суты-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каюцца з рэальнымі ўмовамі будучай прафесійнай дзейнасці, ацэньваючы арганізацыю практыкі ў бягучым навучальным годзе ў цэлым станоўча.

Узаемадзеянне ўніверсітэта з базамі практыкі аказвае вялікі ўплыў на ўзровень і якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, а магчымасць параўнаць змест атрыманай адукацыі з рэальнымі працоўнымі (творчымі) дасягненнямі дазваляе студэнтам актыўна выкарыстоўваць і ўкараняць здабыты практычны вопыт непасрэдна ў адукацыйны працэс, што спрыяе эфектыўнай адаптацыі студэнтаў (на практыцы) і выпускнікоў БДУКМ (на першым працоўным месцы) да прафесійнай дзейнасці, забяспечвае магчымасць развіцця крэатыўнага патэнцыялу навучэнцаў.

*Узровень тэарэтычнай падрыхтоўкі маладых спецыялістаў*

Практычная складальная адукацыйнага працэсу, безумоўна, вельмі важная, яна прадстаўляе сабой аснову (фундамент) падрыхтоўкі будучых прафесіяналаў. Аднак не менш важнай з'яўляецца якасная тэарэтычная падрыхтоўка студэнтаў па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла – філасофіі, сацыялогіі, гісторыі Беларусі, замежнай мове і іншых, якая забяспечвае павышаную запатрабаванасць будучых спецыялістаў на рынку працы, павышае іх канкурэнтаздольнасць, фарміруе ў навучэнцаў высокую ступень адаптыўнасці. Так, студэнты ўніверсітэта высока ацэньваюць аб'ём і якасць атрыманых тэарэтычных ведаў. З меркаваннем студэнтаў і выпускнікоў розных спецыяльнасцей у цэлым згодны і работадаўцы, у водгуках якіх пераважаюць досыць высокія ацэнкі.

*Імідж УВА на рынку адукацыйных паслуг. Пазіцыя БДУКМ у міжнародных рэйтынгах: сістэма Webometrics*

БДУКМ даказаў высокую гарантаваную якасць сваёй дзейнасці, прадэманстраваўшы палепшаныя пазіцыі ў прэстыжным рэпутацыйным рэйтынгу ўніверсітэтаў свету – Webometrics Ranking of World Universities, які лічыцца лепшым з сусветных рэйтынгаў і выкарыстоўваецца для ацэнкі патэнцыялу міжнародных універсітэтаў. У гэтым рэйтынгу БДУКМ, па версіі Webometrics, займае на сённяшні дзень 21-е месца сярод 57 беларускіх УВА, што сведчыць аб эфектыўнасці работы ўніверсітэта па ўсіх напрамках – адукацыйным, навукова-даследчым і творчым.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

За апошнія чатыры гады дасягненні БДУКМ у міжнародным рэйтынгу дэманструюць станоўчую дынаміку: у 2014 г. БДУКМ займаў 28-е месца; у 2015 г. – 27-е; у 2016 г. – 22-е.

*Ацэнка ўзроўню прэстыжнасці БДУКМ: пазіцыя спажыўцоў*

Пазітыўны імідж БДУКМ адзначаюць таксама і студэнты ўніверсітэта, і прафесарска-выкладчыцкі састаў (ПВС). Так, 24,2 % першакурснікаў і 66,3 % выпускнікоў лічаць БДУКМ самай прэстыжнай УВА. 44,2 % першакурснікаў перакананыя, што менавіта ў БДУКМ яны атрымаюць неабходны ўзровень тэарэтычных ведаў, а 76,7 % – неабходны ўзровень практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці. 68,9 % ПВС (у 2015/2016 н. г. – 69,0 %) лічаць месца працы ў БДУКМ, у параўнанні з іншымі УВА Беларусі, больш прэстыжным.

Паляпшэнне іміджавых крытэрыяў БДУКМ аказвае прамое ўздзеянне на канкурэнтаздольнасць універсітэта культуры і мастацтваў сярод іншых беларускіх УВА, што прыцягвае ўвагу абітурыентаў.

Такім чынам, «мысленне на аснове рызык» дазваляе творчай УВА не толькі вызначыць тыя фактары, якія могуць стаць прычынамі невыканання запланаваных мэт у галіне якасці, але і дапамагчы пазбегнуць (або мінімізаваць) негатыўныя вынікі такіх прычын і знайсці магчымасці для выканання патрабаванняў спажыўцоў і павышэння іх (спажыўцоў) ступені задаволенасці якасцю адукацыйных паслуг, што дасць магчымасць і ў далейшым умацоўваць пазіцыі БДУКМ у сферы культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНВЕНТАР НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ: СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ

***А. А. Гулак,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

З моманту далучэння нашай краіны да Канвенцыі па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС, 2004) і ратыфікацыі яе (2007) у беларускім грамадстве актывізаваліся